**ДЫФІРА́МБ** (грэч. dithyrambos), старажытны жанр лірычнага роду л-ры. Першапачаткова ўрачысты харавы спеў у гонар бога Дыяніса, пазней — інш. багоў або герояў. Дзякуючы ўзнёсламу характару набліжаецца да *оды* і *гімна*. У старaж.-бел. л-ры блізкія да Д. *панегірыкі*. Развіццё Д. як жанру звязана з пачаткам эпохі Барока (А.Рымша, Я.Радван). Да Д. звярталіся Сімяон Полацкі, М.Карыцкі. Сучаснае літ.-знаўства называе Д. празмернае ўсхваленне каго- або чаго-небудзь. У бел. л-ры 20 ст. да Д. звяртаўся М.Танк («Дыфірамб»).

*В.І.Еўмянькоў.*

Электронны архіў бібліятэкі МДУ імені А.А. Куляшова